**ЧЫТАВЫЯ** — вёска ў Забычанскім сельскім Савеце, за 29 км на захад ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў — Сураж, 188 км. ад Магілёва, на р. Дзяражня (прыток р. Бесядзь), на поўначы мяжуе з лесам. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Краснаполле — Хоцімск.

Заснавана ў 1920-х г. перасяленцамі з суседніх вёсак. З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. у Касцюковіцкім раёне. У Вялікую Айчынную вайну 28.09.1943 г. вызвалена ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў. Паводле перапісу 1959 г. — 60, у 1970 г. – 35 жыхароў. У 1986 г. 11 гаспадарак, 14 жыхароў, у складзе саўгаса «Брацкі» (цэнтр — в. Брацькавічы). Забудова рэдкая, драўляная, сядзібнага тыпу.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі жыхары адселены.